# СІТУАЦЫЯ ПАД КАНТРОЛЕМ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Станіслава Зася. Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб рабоце сілавога блока, якая ажыццяўляецца ў штатным рэжыме.**

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся сітуацыяй на дзяржаўнай мяжы. Па ацэнцы дзяржсакратара, становішча на рубяжах краіны спакойнае. Пры гэтым больш дэталёва Станіслаў Зась спыніўся на пэўных цяжкасцях, якія маюцца на літоўскім напрамку мяжы. У прыватнасці, ён адзначыў наяўнасць чэргаў, якія ўтвараюцца па сезонных прычынах. З улікам гэтага, як было даложана, прынята рашэнне ўзмацніць работу ў адпаведных пунктах пропуску. У ходзе даклада асобна разгледжана тэма, якая тычыцца сітуацыі на паўднёвым напрамку мяжы, што выклікае пэўны неспакой. Пры гэтым, як запэўніў Станіслаў Зась, сітуацыя і там знаходзіцца пад кантролем.

Размова ішла таксама аб становішчы ўнутры Беларусі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Па ацэнцы дзяржсакратара, бяспека грамадзян забяспечваецца, крымінагенная сітуацыя не пагаршаецца, пры гэтым зніжаецца колькасць асабліва цяжкіх злачынстваў і крадзяжоў. Акрамя таго, абмяркоўвалася выкананне даручэнняў Прэзідэнта па ўмацаванні грамадскай бяспекі ў сельскай мясцовасці.

У ходзе даклада Станіслаў Зась асобна закрануў дзейнні МНС па выкананні папераджальных мерапрыемстваў у сувязі з магчымымі паводкамі і адзначыў, што сітуацыя не выклікае асцярогі.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны таксама аб праведзенай рабоце па кантролі за падрыхтоўкай сельгастэхнікі да пасяўной кампаніі.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў узмацніць дзейнасць сілавога блока па забеспячэнні бяспекі грамадзян.

■ Віншаванні

## «ДЗЕЛЯ ГОДНАГА ЖЫЦЦЯ НАРОДАЎ...»

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Старшыня Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы Аляксандр ЛУКАШЭНКА павіншаваў з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі свайго калегу Уладзіміра Пуціна, Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.**

«Беларусь і Расія, якія ганарацца сваімі дасягненнямі і свята захоўваюць завешчаныя старэйшымі пакаленнямі традыцыі, паспяхова рэалізуюць сумесны інтэграцыйны праект, паглыбляюць стратэгічнае партнёрства ва ўсіх сферах, — гаворыцца ў віншаванні. — Сучасныя рэаліі дыктуюць аб'ектыўную неабходнасць у больш цеснай каардынацыі дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне годнага жыцця народаў нашых краін».

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што мэтанакіраваныя намаганні нашых дзяржаў дадуць новы імпульс усебаковаму супрацоўніцтву Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Кіраўнік краіны таксама даслаў віншаванні са святам Дзмітрыю Мядзведзеву, старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі; Валянціне Матвіенцы, старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі; Сяргею Нарышкіну, старшыні Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі; Генадзю Зюганаву, старшыні фракцыі КПРФ у Дзяржаўнай думе Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі; Рыгору Рапоту, дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы; Кірылу, Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

■ Да Дня яднання

# НЕ ЎПУСЦІЦЬ ШАНЦ

### Далучыцца да саюзных праграм можа любы рэгіён нашай краіны

**Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі дае рэальную аддачу для людзей: гэта і адсутнасць мяжы паміж краінамі, і даступнасць медыцынскіх, адукацыйных паслуг, і магчымасць працаўладкавання. Акрамя пералічанага на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы рэалізуецца шэраг лакальных праграм. У Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах, намеснік старшыні Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі, расказаў карэспандэнту «Звязды» пра ролю парламенцкага складніка Саюзнай дзяржавы і пра перспектывы развіцця беларуска-расійскага інтэграцыйнага праекта.**



#### ЁСЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫЯ АТРЫБУТЫ

— Сёння я, не баючыся гучных слоў, магу сказаць, што Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі — гэта найбольш прагрэсіўнае інтэграцыйнае аб'яднанне, — гаворыць Віталь Бусько. — Мы ўжо маем настолькі грунтоўную ўніфікаваную дагаворную базу, што яна ахоплівае практычна ўсе кірункі. Тут, акрамя эканомікі, і сацыяльная сфера, і адукацыя, і свабода перамяшчэння... Што самае галоўнае — мы маем бюджэт, які зацвярджаецца Парламенцкім сходам на сесіі. У Саюзнай дзяржавы ёсць усе атрыбуты дзяржавы — і Савет Міністраў, і парламент.

— Калі парламентарыі кантактуюць у рамках Парламенцкага сходу, то гэта спрыяе ўніфікацыі заканадаўства, — адзначае дэпутат. — Мы вучымся ў расіян, расіяне — у нас. На жаль, пакуль мы, дэпутаты Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі, робім вельмі мала сумесных заяў. Трэба выкарыстоўваць трыбуну Міжпарламенцкага саюза, Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Тым больш што пакуль у Еўразійскім эканамічным саюзе ў нас няма парламенцкага складніка — толькі двухбаковыя кантакты.

#### СКАРЫСТАЦЬ УСЕ ГРОШЫ

Сённяшні бюджэт Саюзнай дзяржавы — 6,6 мільярда расійскіх рублёў. Віталь Бусько заўважае, што гэта сур'ёзная сума.

— Агульны аб'ём павялічыўся на 1,7 мільярда — за кошт рэшты мінулага бюджэту, а таксама зароблены грошай, — паведаміў парламентарый. — На сродкі бюджэту Саюзнай дзяржавы ўжо фінансуецца 7 дзейных праграм, у хуткім часе пачнецца рэалізацыя чатырох новых праграм, ухваленых Саветам Міністраў Саюзнай дзяржавы.

Дэпутат расказаў, што калі ён сустракаецца ў сваёй акрузе з выбаршчыкамі, кіраўніцтвам раёна, прадпрыемстваў, то заўсёды раіць ім прадстаўляць свае прапановы па саюзных праграмах.

— Нейкую частку ў праграме амаль заўсёды можна прысвяціць пэўнаму раёну, — запэўнівае Віталь Бусько. — Амаль заўсёды ёсць магчымасць уключыць пэўнае прадпрыемства, установу ў сувыканаўцы праграмы.

Парламентарый звярнуў увагу, што саюзны бюджэт не заўсёды выкарыстоўваецца цалкам, і гэта не вельмі добра.

— У наш час гэта ўвогуле недапушчальна, — лічыць Віталь Бусько. — Атрымліваецца, што праграмы прапрацаваны не да канца або для іх не знайшлі годных выканаўцаў. На апошняй 49 сесіі шмат казалася пра больш жорсткі кантроль: і за тымі, хто не выкарыстоўвае выдаткаваных сродкаў, і за тымі, хто выкарыстоўвае — трэба глядзець, што атрымліваецца ў выніку.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** ■

# КАЛІ МЯНЯЦЬ — ДЫК З РОЗУМАМ

### Удасканаленне сістэмы адукацыі павінна праходзіць на аснове існуючых дасягненняў, без рэформаў і неабдуманых рашэнняў

**На гэта звярнуў увагу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на праведзенай нарадзе, прысвечанай актуальным пытанням развіцця сістэмы адукацыі, паведамляе БЕЛТА.**

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, жыццё падштурхнула да разгляду шэрагу важных пытанняў. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што сур'ёзна была прааналізавана сітуацыя ў будаўнічай сферы і выпрацаваны шэраг адпаведных нарматыўна-прававых актаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтак жа зрабілі з вырашэннем праблем жыллёва-камунальнай гаспадаркі, з жыллёва-камунальнымі паслугамі, падкрэсліўшы, што «да гэтага пытання мы не проста вернемся, а будзем працягваць работу». Прэзідэнт закрануў і сельскую гаспадарку: «Мы таксама збіраліся на высокім узроўні, прымалі рашэнні, выпрацоўвалі даручэнні, працавала камісія. Пасля завяршэння пасяўной кампаніі мы яшчэ раз вернемся да тэмы сельскай гаспадаркі».

Што датычыцца асноўнай тэмы нарады — адукацыі, Прэзідэнт нагадаў, што пры назначэнні новага кіраўніцтва Міністэрства адукацыі была пастаўлена канкрэтная задача — удасканаленне сістэмы, заснаванае на ўжо існуючых дасягненнях, а не рэфармаванне і ломка. «Нам з савецкіх часоў дасталася нядрэнная сістэма адукацыі, мы яе пераўтварылі. Мы да гэтага вярталіся не адзін раз, рыхтавалі новыя падручнікі. Тым не менш там яшчэ хапае праблем», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

«Мы выйшлі на шэраг праблемных пытанняў, і па іх былі дадзены канкрэтныя даручэнні: разабрацца з актуальнымі праблемамі, якія стаяць перад усімі намі, перад грамадствам», — падкрэсліў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, гэтыя пытанні хвалююць усіх, і яны вельмі сур'ёзна звернуты ў будучыню.

Віцэ-прэм'ер Наталля Качанава праінфармавала аб выкананні даручэнняў Прэзідэнта, якія былі дадзены ўраду па пытаннях адукацыі. Яна расказала аб праведзеных у розных рэгіёнах краіны сустрэчах з педагагічнымі калектывамі, выхавальнікамі дзіцячых дашкольных устаноў, дырэктарамі навучальных устаноў. Віцэ-прэм'ер бліжэй азнаёмілася з работай многіх дзіцячых садоў, школ, сярэдніх спецыяльных, прафесійна-тэхнічных устаноў, ВНУ і пабывала на ўроках. Наталля Качанава запэўніла, што ва ўстановах адукацыі сёння стабільнае становішча. Яна таксама падкрэсліла: «Мы адышлі ад усялякіх рэформаў і неабдуманых эксперыментаў. Нам сёння не трэба штосьці кардынальна ламаць».

■ Парламенцкі дзённік

# НОВАЯ СТАРОНКА Ў АДНОСІНАХ

### Упершыню за шмат гадоў нас наведала балгарская дэлегацыя

**Беларусі і Балгарыі трэба працягваць супрацоўніцтва, якое існуе ў нас ужо даўно. На гэтым зрабіў акцэнт Віктар Гумінскі, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў, падчас сустрэчы з балгарскімі парламентарыямі.**

— Балгарскі і беларускі народы маюць у многім сумесную гісторыю, — адзначыў віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў. — Думаю, сёння нашы краіны зацікаўлены ў тым, каб супрацоўнічаць.

Гэта першы візіт парламенцкай дэлегацыі за амаль 14 гадоў: папярэдні абмен візітамі на ўзроўні кіраўніцтва парламентаў дзвюх краін адбыўся ў 1998-2002 гадах.

— Лепш за ўсё пачаць з развіцця міжпарламенцкіх адносін, — прапанаваў Віктар Гумінскі, — таму што гэта палітычная аснова. Ваш візіт пасля доўгага перапынку першы. Хацелася б, каб ён адкрыў новую старонку і мы больш актыўна працавалі дзеля развіцця ўсебаковых адносін паміж нашымі краінамі.

У 2015 годзе наш тавараабарот з Балгарыяй дасягнуў свайго максімуму і склаў амаль 130 мільёнаў долараў — гэта неблагая аснова для развіцця адносін.

Сяргей Канопліч, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, кіраўнік працоўнай групы Нацыянальнага сходу нашай краіны па супрацоўніцтве з парламентам Балгарыі, лічыць, што гэты візіт дае нам перспектыву цеснага далейшага супрацоўніцтва не толькі на міжпарламенцкім узроўні, але і «ў пытаннях выканаўчай улады, асобных прадпрыемстваў, інвестыцыйных праектаў».

У сваю чаргу Пётр Кынеў, старшыня Камісіі Народнага сходу Балгарыі па эканамічнай палітыцы і турызме, асабліва акцэнт зрабіў на развіцці адносін у турыстычным кірунку. Ён звярнуў увагу, што для яго дзяржавы сфера турызму з'яўляецца адной з найважнейшых.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** ■

**ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Дзявятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу 4 красавіка 2016 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).**

**Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 4 красавіка 2016 года з 09.15 да 09.50 у фае залы пасяджэнняў.**


**ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции»**
**ДОПОЛНИТЕЛЬНО ИНФОРМИРУЕТ к публикации от 30 марта 2016 года:**

1. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **строительство.**
2. Дата проведения годового собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **29 марта 2016 г.**
3. Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения: **приняты к сведению.**

**Аудиторское мнение**

По результатам проведения аудита аудитором Дробышевым Александром Ивановичем, осуществляющим деятельность в качестве индивидуального предпринимателя, можно сделать вывод, что бухгалтерская отчетность аудируемого лица, подготовленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение общества на 31 декабря 2015 года, а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения общества за год, закончившийся на указанную дату, при этом совершаемые обществом финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют национальным стандартам бухгалтерского учета и отчетности.

УНП 600122771


**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне начальніку Інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Ермаловічу Віталю Віктаравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**